# ПАКІНУЎ АФГАН АДНЫМ З АПОШНІХ

*...Той ноччу «духі» з'явіліся нечакана, як і заўсёды. Пад покрывам цемры яны вярталіся на сваю базу з чарговага набегу. І тут на іх шляху апынулася 4-я аўтаманеўровая група, у саставе якой служыў Юрый Дзенісёнак. Бой быў жорсткім, хоць і нядоўгім. «Духі» кінуліся наўцёкі, забраўшы сваіх загінуўшых і параненых. А савецкія байцы страт не панеслі.*

Гэта, як лічыць сам Юрый Цімафеевіч, звычайны эпізод з працяглай службы ў Афганістане. Нарадзіўся ён у вёсцы Дубровы, скончыў Шайцераўскую школу. А пасля Боркавіцкага СПТВ стаў салдатам Савецкай арміі.

Службу пачаў у Тэрмезкім пагранатрадзе. Вучэбка, затым – рота суправаджэння цягнікоў. І – Афганістан.

Зноў граніца, але ўжо з таго боку. Аўтаманеўровая група кругласутачна патрулявала свой участак, перакрываючы шляхі душманам.

– Кожную мінуту мы былі гатовы ўзняцца па трывозе, – успамінае Юрый. – А жылі ў бліндажах пасярод пустыні. Нам, самі разумееце, той клімат не падыходзіў. Спякота пад 50 градусаў, вады не хапала, ды і тую, што была, без кіпячэння ўжываць немагчыма. Аднак, нягледзячы на ўсе цяжкасці, свой абавязак мы выканалі. І не шкадуем аб гэтым.

На пытанне аб ураджаннях, якія засталіся. Юрый адзначае фанатычную ўпартасць «духаў». Пасля аднаго з баёў давялося пабачыць сярод :

– Генерал Громаў перайшоў знакаміты мост у 11.30, а наша група, па-сутнасці, ар'ергард, у 14.30. Гэты момант таксама не забудзецца ніколі.

Вярнуўшыся да мірнага жыцця, Юрый скончыў Гарадоцкі сельгастэхнікум. Цяпер працягвае службу ў пагранкамендатуры, старшы прапаршчык. Разам з жонкай Вольгай Васільеўнай выхоўвае сына. Пажадаем ім здароўя і поспехаў.

***М. Каткоў***

*Дзвінская праўда (Верхнядзвінск). — 2013. — 15 лют. — С. 2.*